common culture and language offers good opportunities for cross-border initiatives and cooperation. One of the most important problems is that still many tasks connected with cross-border trade and cooperation have not been delegated to regional/local authorities.

In general, for better development of cross-border trade the following steps should be concerned:

• further improvement of the transport and communication infrastructure in and between adjacent Belarusian and foreign border regions which forms the base for sustainable cross-border development and related new economic activities,

• improvement of legislative and institutional frames to cross-border trade, it means e.g. further implementation of cross-border institutions including trade unions, euroregions or similar structures,

• elaboration and implementation comprehensive state assistance programs to improved exploitation of border regions specific development potential (regionalized cross-border trade operational programmes),

• improvement of cross-border cooperation between small and medium-sized enterprises (old industrial relationships have broken down and new ones have not developed as yet), promotion abroad of so called regional products, assistance in creating cross-border trade networks etc.,

• also need to be overcome many competence problems.

Through the principles of partnership and subsidiarity, border regions should be more involved in the decision-making process.

The great importance to economic development of border regions and — in macro scale, national economy — has diversification of activities in rural areas to avoid further depopulation, quality improvement of "human resources", particularly in border regions and solution of different social problems.

***Г.П. Бушчык,*** *канд. гіст. навук, дацэнт*

БДУ (Мінск)

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ АДКРЫТАЙ ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ

Па ступені функцыянальнай адкрытасці эканомікі Рэспубліка Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідэраў. Аб'ём знешнегандлёвага абароту краіны ў 1992—2004 гг. перавышаў ВУП у сярэднім прыкладна на 20 %. Эканоміка Беларусі (найперш — прамысловасць) пачала фарміравацца як адкрытая, разлічаная на спажы-

ванне значнай долі сыравіны, завоз камплектуючых дэталяў і вываз большай часткі выпрацаванай прадукцыі, пасля другой сусветнай вайны. Прамысловая палітыка савецкага кіраўніцтва адносна БССР у перыяд пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі была накіравана на стварэнне ў Беларусі вытворчасці, якая задавальняла б у асобных відах прадукцыі патрэбы ўсяго Савецкага Саюза, а з часам — і другіх сацыялістычных краін.

Сам працэс аднаўлення (а дакладней — пабудовы новага прамысловага комплексу рэспублікі) характарызаваўся актыўным удзелам у ім як усяго Савецкага Саюза, так і замежжа. Уласнымі даходамі бюджэт Беларусі забяспечваў менш за палову патрэб па фінансаванню аднаўлення і развіцця гаспадаркі ў 1945—1950 гг. Будаўніцтва і аснашчэнне найбуйнейшых прамысловых аб'ектаў поўнасцю фінансаваліся з Саюзнага бюджэту. Адначасова абсталяванне для прадпрыемстваў паступала ў лік рэпарацыйных паставак з Германіі, па лініі ААН—ЮНРРА (Арганізацыя дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый), з іншых рэспублік СССР. У 1960-х гг. машынабудаванне, хімічная і нафтахімічная, легкая і харчовая прамысловасць сталі вядучымі галінамі беларускай эканомікі. За 1951—1990 гг. аб'ём вытворчасці толькі ў машынабудаўнічым комплексе Беларусі павялічыўся больш чым у 300 разоў. У 1975 г. удзельная вага БССР, якая займала 0,9 % тэрыторыі і мела 3,7 % насельніцтва СССР, у агульнасаюзнай вытворчасці мінеральных угнаенняў склала 12,2 %, у тым ліку калійных угнаенняў — 43,5, матацыклаў — 22,3, хімічных валокнаў і ніцей — 15,9, трактароў — 15,6, падшыпнікаў качэння — 14,2, металарэзных станкоў і веласіпедаў — па 14, наручных гадзіннікаў — 12,1, тэлевізараў — 7,1, грузавых аўтамабіляў — 5,1 %.

З пачатку 1950-х гг. пачынаецца значны вываз беларускай прадукцыі ў іншыя рэгіёны СССР і за межы краіны, які пастаянна павялічваўся. У сярэдзіне 1970-х гг. удзельная вага вывазу ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці БССР складала больш за 40 %. Увоз прамысловай прадукцыі ў агульным аб'ёме яе спажывання ў рэспубліцы перавысіў 39 %. Пры гэтым вываз прадукцыі з Беларусі ў цэлым значна перавышаў яе ўвоз у рэспубліку. У канцы 1980-х гг. у абмене прамысловымі таварамі з іншымі рэспублікамі СССР Беларусь штогод мела дадатнае сальда ў памеры больш за 3 млрд р., разам з тым у гандлі з замежнымі краінамі яна мела адмоўнае сальда ў памеры больш за 2 млрд р.

Агульны баланс быў на карысць рэспублікі. Аднак трэба ўлічваць тое, што ўнутрысаюзныя цэны на шэраг тавараў, што паступалі ў рэспубліку ў той час, значна адрозніваліся ад сусветных. Напрыклад, у 1991 г. яны складалі па прыродным газе 3 %, бензі-

не і дызельным паліве — 9, нафце — 13, пракаце чорных металаў — 25 % сусветных.

У другой палове XX ст. з Беларусі ў іншыя рэгіёны СССР і за яе межы традыцыйна вывозілася больш за 90 % выробленых грузавых аўтамабіляў, больш за 80 % — металарэзных станкоў, трактароў, калійных угнаенняў, хімічных валокнаў, каля паловы — мяса і масла. Аднак экспартныя магчымасці БССР выкарыстоўваліся недастаткова. Доля рэспублікі ў знешнегандлёвым абароце СССР была значна ніжэй, чым у агульнасаюзнай вытворчасці пэўных відаў прадукцыі. У 1989 г. толькі 9,2 % агульнага аб'ёму вывазу беларускай прадукцыі машынабудавання, лёгкай, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці было экспартавана за межы СССР.

Такім чынам, у другой палове XX ст. эканоміка Беларусі фарміравалася ў межах СССР як выключна адкрытая, што вымушае і ў новых гістарычных умовах імкнуцца захоўваць і пашыраць рынкі збыту традыцыйнай вытворчасці, павышаць якасць і канкурэнтаздольнасць тавараў.

**В.П. Ельсуков**, *канд. экон. наук*,
**В.Н. Тамашевич**, *канд. экон. наук*

НИИ статистики (Минск)

## СТАТИСТИЧЕСКОЕ ОЦЕНИВАНИЕ ВЛИЯНИЯ ЭКСПОРТНО-ИМПОРТНЫХ ОПЕРАЦИЙ НА ВВП

Для оценивания влияния результатов внешнеторговой деятельности на ВВП республики авторами разработана имитационная модель, отражающая взаимосвязи показателей системы национальных счетов (СНС). Информационной основой для моделирования выступили данные симметричных таблиц «Затраты—выпуск». При формализации существующих связей показателей СНС получают базовую функциональную модель для ВВП

$$ВВП = КП + ВН + ЧЭ, \tag{1}$$

где *ВВП* — внутренний валовой продукт; *КП* — расходы на конечное потребление; *ВН* — валовое накопление; *ЧЭ* — чистый экспорт (разница между величинами экспорта и импорта). Одновременно действует равенство

$$В + И + Нп - Сп = ПП + КП + ВН + Э, \tag{2}$$

где *В* — выпуск в основных ценах; *И* — импорт товаров и услуг; *Нп* — налоги на продукты; *Сп* — субсидии на продукты; *ПП* — промежуточное потребление; *КП* — конечное потребление; *ВН* — валовое накопление; *Э* — экспорт товаров и услуг.